Пракурору г. Мінска
вул. Ракаўская, 38 220004 г. Мінск

Цэнтральная выбарчая камісія
па выбарах і правядзенні
рэспубліканскіх рэферэндумаў
вул. Савецкая, 11 (Дом урада)
220 030 г. Мінск

Мінская гарадская выбарчая камісія
пр-т Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск

Лагвінца Аляксандра Іванавіча,
кандыдата ў дэпутаты
Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў
па Сухараўскай выбарчай акрузе № 30,
вул. Чайлыткі, д. ____, кв. ___ г. Мінск

**ЗАЯВА**

У сувязі з грубымі і наўмыснымі парушэннямі Канстытуцыі Беларусі і дзейнага выбарчага заканадаўства прашу адмяніць выбары дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па Сухараўскай выбарчай акрузе № 30 і прыняць усе неабходныя меры па аднаўленні законнасці і павазе прынцыпаў справядлівасці, галоснасці і дэмакратычнасці выбараў у Фрунзенскім раёне г. Мінску на падставе наступнага:

**1. Неўнясенне ў спісы выбарцаў значнай колькасці выбарцаў.** У парушэнне Арт. 15 Выбарчага кодэксу колькасць выбарцаў па Сухараўскай выбарчай акрузе № 30 абуральным чынам заніжаная.

**1.1.** Па Сухараўскай выбарчай акрузе № 30 налічваецца 17 127 кватэраў, паводле афіцыйнай інфармацыі агульная колькасць выбарцаў складае усяго 20 401. Лічба ў 20 401 выбарцаў, якія зарэгістраваныя ў 17 127 кватэрах пярэчыць любому здароваму сэнсу. Пры такой колькасці кватэраў рэальная колькасць выбарцаў павінна быць каля 34 000!

| Вуліца | Колькасьць кватэраў у дамах, што аднесеныя да акругі |
|---|---|
| Гарэцкага | 1018 |
| Чайлыткі | 1224 |
| Фёдарава | 1801 |
| Лабанка | 1750 |
| Панчанкі | 3055 |
| Шаранговіча | 2730 |
| Сухараўская | 3223 |
| Мазурава | 102 |
| Скрыпнікава | 2224 |
| **УСЁ РАЗАМ** | **17127** |

Больш падрабязна гл. Дадатак 1.

**1.2.** У парушэнне Арт. 17 Выбарчага кодэксу (не больш 3000 выбарцаў на адным участку) ўчастак для галасавання №27, на тэрыторыі якога знаходзяцца 4061 кватэра, відавочна

налічвае больш за 3000 выбарцаў, а рэальна каля 8000 выбарцаў. Падаю колькасць кватэраў па вуліцах:

| | |
|---|---|
| Панчанкі, дамы № 50, 52, 54, 60, 62, 68, 70, 74, 76, 78, 80 | 1449 |
| Сухараўская дамы № 68, 70 | 286 |
| Мазурава дом № 27 | 102 |
| Скрыпнікава дамы № 1, 3, 5, 7, 9, 11, 15, 19, 21, 25, 27, 29, 31, 33, 35 | 2224 |
| **Разам** | **4061** |

**1.3.** Па ўсім Фрунзенскім раёне, дзе паводле інфармацыі сайту Мінгарвыканкаму больш за 373 тысяч чалавек (http://www.minsk.gov.by/ru/org/8/history/), агульная колькасць выбарцаў паводле афіцыйнай інфармацыі складае усяго 220 тысяч 17 чалавек. Гэта азначае, што ў Фрунзенскім раёне налічваецца больш за 153 тысячы грамадзянаў ва ўзросце да 18 гадоў (41%), а гэта не можа адпавядаць рэчаіснасці. Больш за тое, параўнальна з агульнай колькасцю выбарцаў паводле афіцыйнай інфармацыі ад студзеня 2007, колькасьць выбарцаў у раёне, дзе ўводзіцца ў дзеянне амаль 44% гарадскога жылля, нават знізілася з 221723 да 220.017.

Афіцыйная колькасць выбарцаў, Фрунзенскі раён

| | 11.12. 2002 | Акруга | 24.10. 2006 | 15.01. 2007 | Акруга | 03.02. 2010 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 22.829 | СУХАРАЎСКАЯ № 27 | 20.808 | 23.232 | ЗАХОДНЯЯ № 29 | 23695 |
| | 22.057 | АДОЕЎСКАЯ № 28 | 24.030 | 25.249 | СУХАРАЎСКАЯ № 30 | 20401 |
| | 24.500 | ЗАХОДНЯЯ № 29 | 22.157 | 22.053 | ЧЫРВОНАБОРСКАЯ № 31 | 21916 |
| | 22.337 | АДЗІНЦОЎСКАЯ № 30 | 21.804 | 22.293 | КАМЕННАГОРСКАЯ № 32 | 21718 |
| | 24.307 | ПУШКІНСКАЯ № 31 | 20.831 | 20.977 | КУНЦАЎШЧЫНСКАЯ № 33 | 23262 |
| | 23.667 | КУНЦАЎШЧЫНСКАЯ № 32 | 20.811 | 20.909 | МАСЮКОЎШЧЫНСКАЯ № 34 | 19446 |
| | 22.106 | МАСЮКОЎШЧЫНСКАЯ № 33 | 21.816 | 21.727 | ЖУДРОЎСКАЯ № 35 | 23509 |
| | 23.243 | МАТУСЕВІЧСКАЯ № 34 | 20.802 | 20.804 | АДОЕЎСКАЯ № 36 | 22851 |
| | 21.456 | ЖУДРОЎСКАЯ № 35 | 22.427 | 23.482 | КАЛЬВАРЫЙСКАЯ № 37 | 22 002 |
| | 23.540 | КАЛЬВАРЫЙСКАЯ № 36 | 20.897 | 20.997 | ПУШКІНСКАЯ № 38 | 21 217 |
| Разам | **230.042** | | **216.383** | **221723** | | **220.017** |

**2. Непразрыстае і прадузятае ўтварэнне участковых выбарчых камісіяў.** Усе 11 участковых выбарчых камісіяў па Сухараўскай выбарчай акрузе № 30 былі ўтвораныя паводле папярэдняга спісу, складзенага Адміністрацыяй Фрунзенскага раёну. У камісіі не былі ўключаныя аніводны з 13 незалежных прэтэндэнтаў, за якіх падпісаліся 191 выбарца. Усе вылучэнцы грамадзянаў, а сярод іх Віктар Карнеенка, Іна Кулей, Эніра Браніцкая, Андрэй Сушко, Аляксей Кавалец, Аляксандр Таўстыка, Дар'я Каткоўская, Андрэй Ляховіч, Алег Гаеўскі, Аксана Колб, Алег Тарасевіч, Ірына Бохан, маюць вялікі досвед правядзення выбарчых кампаніяў і назірання за выбарамі як у Беларусі, так і за мяжой, 5 вылучэнцаў самі жывуць у Сухараве, а 6 – маюць юрыдычную або паліталагічную адукацыю. Больш за тое, мінімум 9 з 11 камісіяў утвораныя па вытворчым прынцыпе, калі яны выключна складаюцца з падначаленых па службе супрацоўнікаў аднаго прадпрыемства або ўстановы, а ўначальваюцца – кіраўнікамі (ЖЭС, школы, ЗАТ Тытуньінвест).

**3. Невыкананне рашэнняў Мінгарвыканкаму адносна размяшчэння агітацыйных матэрыялаў.** Адміністрацыя Фрунзенскага раёну і Фрунзенская раённая выбарчая камісія не выканалі **пункт 3** рашэння № 475 Мінгарвыканку ад 25 лютага 2010 г., а Старшыня Фрунзенскай раённай выбарчай камісіі Жаголкіна З.У. адмовіліся прадставіць мне спіс

месцаў, вызначаных у Фрунзенскім раёне для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў кандыдатаў у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 26-га склікання на інфармацыйных стэндах, падаўшы толькі пералік месцаў устаноўкі інфармацыйных стэндаў, які быў прыняты Мінгарвыканкамам. (Гл. Дадатак 2)

**4. Адмова ў прадстаўленні інфармацыі кандыдату ў дэпутаты.** У парушэнне Арт. 34 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Арт. 13 ды 74 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь Старшыня Фрунзенскай раённай выбарчай камісіі Жаголкіна З.У. у чарговы раз (як і ў 2007 годзе) адмаўляецца прадставіць мне інфармацыю пра агульную колькасьць грамадзянаў, якія ўнесеныя ў спісы выбарцаў па кожным з 11 участкаў для галасавання па Сухараўскай выбарчай акрузе № 30. (Гл. Дадатак _3_)

**5. Парушэнні падчас датэрміновага галасавання.**

**5.1.** Па Сухараўскай выбарчай акрузе № 30 усе участкі для датэрміновага галасаваньня, якія знаходзяцца ў адным будынку школы, упершыню былі размешчаныя ў розных памяшканнях, што ускладніла працэс назірання за датэрміновым галасаваннем. У першы дзень датэрміновага галасавання, на ўчастках, дзе вялося назіранне, працэнт яўкі выбарцаў быў у некалькі разоў меншы за працэнт яўкі на ўчастках, дзе не вялося назіранне. Больш за тое, мне як кандыдату ў дэпутаты, маім давераным асобам, а таксама прадстаўніку вышэйстаячай камісіі было адмоўлена азнаёміцца са сьпісамі выбарцаў і спраўдзіць наяўнасьць подпісаў за атрыманыя бюлетэні для галасавання на тых участках, дзе не вялося назіранне. (Гл. Дадатак _4__).

**5.2.** У першы дзень датэрміновага галасавання 20 красавіка 2010 году на ўваходзе ў гімназію №33 і школу № 212, дзе знаходзяцца адпаведна выбарчыя ўчасткі №№ 17, 18, 19 і №№20 і 21, быў вывешаны друкаваны зварот ад імя педагагічных калектываў з заклікам да **актыўнага** ўдзелу ў датэрміновым галасаванні (фотаздымкі прыкладаюцца, гл. Дадатак _5__). Зважаючы на тое, што дырэктар гімназіі №33 Якубоўская А.Б. і дырэктар школы № 212 Андрушчанка Г.У. з'яўляюцца старшынямі ўчастковых выбарчых камісіяў адпаведна № 19 і № 20, дадзены зварот з’яўляецца формай ціску на выбарцаў гэта, а таксама злоўжываннем службовым становішчам і ўмяшаннем у выбарчы працэс.

_______________________ Лагвінец А. І.

(подпіс) (ініцыялы, прозвішча кандыдата ў дэпутаты)

"22" красавіка 2010 г.

Дадатак 1. Колькасць кватэраў па Сухараўскай выбарчай акрузе №30

| Дом, Нумар | Колькасьць кватэраў | |
|---|---|---|
| Вуліца Гарэцкага | | |
| 25 | 77 | |
| 27 | 113 | |
| 29 | 96 | |
| 31 | 95 | |
| 35 | 40 | |
| 37 | 40 | |
| 39 | 71 | |
| 41 | 220 | |
| 51 | 186 | |
| 53 | 40 | |
| 55 | 40 | |
| Разам | 1018 | 1018 |
| | | |
| Вуліца Чайлыткі | | |
| 1 | 255 | |
| 3 | 95 | |
| 9 | 95 | |
| 11 | 72 | |
| 13 | 123 | |
| 15 | 179 | |
| 17 | 132 | |
| 19 | 160 | |
| 21 | 113 | |
| Разам | 1224 | 1224 |
| | | |
| Вуліца Фёдарава | | |
| 3 | 118 | |
| 5 | 297 | |
| 9 | 175 | |
| 11 k. 1 | 91 | |
| 11 k. 2 | 95 | |
| 13 к. 1 | 113 | |
| 13 к. 2 | 190 | |
| 17 к. 1 | 71 | |
| 17 к. 2 | 182 | |
| 19 | 190 | |
| 21 | 114 | |
| 23 | 165 | |
| Разам | 1801 | 1801 |
| | | |
| Вуліца Лабанка | | |
| 81 | 255 | |
| 91 | 118 | |
| 85 | 64 | |
| 89 | 306 | |
| 97 | 306 | |
| 99 | 54 | |
| 109 | 186 | |
| 102 | 69 | |
| 104 | 94 | |
| 106 | 132 | |

| | | |
|---|---|---|
| 108 | 70 | |
| 110 | 96 | |
| Разам | 1750 | 1750 |

Вуліца Панчанкі

| | | |
|---|---|---|
| 12 | 69 | |
| 14 | 160 | |
| 16 | 69 | |
| 18 | 77 | |
| 20 | 104 | |
| 22 | 99 | |
| 24 | 99 | |
| 26 | 245 | |
| 38 | 95 | |
| 40 | 139 | |
| 42 | 143 | |
| 44 | 212 | |
| 46 | 95 | |
| 50 | 177 | |
| 52 | 103 | |
| 54 | 140 | |
| 60 | 134 | |
| 62 | 142 | |
| 68 | 119 | |
| 70 | 134 | |
| 74 | 111 | |
| 76 | 143 | |
| 78 | 142 | |
| 80 | 104 | |
| Разам | 3055 | 3055 |

Вуліца Шаранговіча

| | | |
|---|---|---|
| 36 | 95 | |
| 38 | 95 | |
| 44 | 95 | |
| 46 | 95 | |
| 48 | 467 | |
| 52 | 285 | |
| 54 | 112 | |
| 56 | 107 | |
| 60 | 133 | |
| 62 | 94 | |
| 64 | 171 | |
| 66 | 96 | |
| 70 | 132 | |
| 72 | 143 | |
| 74 | 132 | |
| 76 | 94 | |
| 78 | 135 | |
| 80 | 143 | |
| 82 | 106 | |
| Разам | 2730 | 2730 |

Вуліца Сухараўская

| | |
|---|---|
| 8 | 171 |
| 10 | 71 |
| 12 | 107 |

| | | |
|---|---|---|
| 14 | 132 | |
| 68 | 142 | |
| 70 | 144 | |
| 1 | 301 | |
| 3 | 94 | |
| 5 | 270 | |
| 7 | 94 | |
| 13 | 169 | |
| 15 | 86 | |
| 17 | 148 | |
| 21 к. 1 | 156 | |
| 21 к. 2 | 94 | |
| 27 | 179 | |
| 39 | 102 | |
| 41 | 94 | |
| 45 | 96 | |
| 51 | 99 | |
| 55 | 99 | |
| 59 | 71 | |
| 61 | 71 | |
| 63 | 138 | |
| 65 | 95 | |
| Разам | 3223 | 3223 |

Вуліца Мазурава

27 102102

Вуліца Скрыпнікава

1172
3142
5208
7177
9107
11127
15127
19187
21178
25187
27116
29142
31106
33106
35142

| | | |
|---|---|---|
| Разам | 2224 | 2224 |
| **УСЁ РАЗАМ** | | **17127** |